Пікулік А.

# ЛЁС ЧАЛАВЕКА

У газеце "Праўда" 31 снежня – 1 студзеня 1957 гг. было змешчана алавяданне М. Шолахава "Лёс чалавека", якое неўзабаве стала сусветна вядомым. Лёс галоўнага героя твора Андрэя Сакалова, савецкага воіна, які перанёс усе жахі фашысцкага палону і не скарыўся, збярог сваю высокую чалавечую годнасць, хваляваў і хвалюе кожнага, хто чытаў гэтае апавяданне. Аднак не ўсе ведаюць, што ў нейкай меры правобразам героя з'яўляецца рэальная асоба – лётчык-беларус, ураджэнец вёскі Сахараўка Горацкага раёна Магілёўскай вобласці Рыгор Усцінавіч Дольнікаў.

Хто ж ён, гэты чалавек?

Дык вось, сталася так, што пасля заканчэння Панкратаўскай сямігодкі падлетак Рыгор Дольнікаў трапіў у Мінскае ФЗВ чыгуначнікаў. Пасля ён паступае ў Мінскі аэраклуб і паспяхова заканчвае яго. А вясной 1940 года Рыгор Дольнікаў становіцца курсантам Батайскай школы ваенных пілотаў імя Сярова. Трэба сказаць, што з пачаткам вайны Батайская школа пераходзіць на паскораную праграму падрыхтоўкі лётчыкаў-знішчальнікаў.

У канцы 1942 года Рыгор Дольнікаў заканчвае вучобу. Адразу ж ён пачынае служыць у 25-м запасным авіяпалку, які базіраваўся тады ў Азербайджане. Там пілоты працягваюць лётную вучобу, вывучаюць новую авіяцыйную тэхніку, забяспечваюць уваход у Іран Чырвонай Арміі. На фронт Дольнікаў трапляе толькі летам 1943 года. Служыць яму давялося ў 100-м гвардзейскім знішчальным палку 9-й гвардзейскай авіядывізіі. Гэта было праслаўленае злучэнне, у якім служыла нямала выдатных лётчыкаў, сярод якіх – знакаміты А. І. Пакрышкін.

У канцы лета дывізія ўступіла ў баявыя дзеянні па вызваленні Украіны. Тут, у небе Данбаса, Рыгор Дольнікаў атрымаў сваю першую перамогу – збіў першы варожы самалёт.

Пасля было нямала баявых вылетаў, нямала перамог, і хутка Дольнікаў стаў лічыцца ў палку спрактыкаваным вопытным лётчыкам. Аднак у адным з баёў яго самалёт падбілі, і лётчык вымушаны быў скакаць з парашутам. Як толькі парашут раскрыўся, яго пачалі абстрэльваць варожыя самалёты. Рыгор падцягнуў стропы і хутка панёсся ўніз. Ад удару аб зямлю страціў прытомнасць. Прыйшоў у сябе ад таго, што яго моцна білі немцы.

...У памяшканні станічнай школы сядзелі трое гітлераўцаў. Стол быў застаўлены закуссю, бутэлькамі, пад сталом – вялізная аўчарка.

Прывялі Дольнікава, параненага, збітага, галоднага. Пачалі допыт. На пытанне, дзе знаходзіцца аэрадром, які нумар палка, не адказаў, а калі спыталі прозвішча, назваўся Рыгорам Сакаловым. Адзін з п'яных

гестапаўцаў працягнуў яму чарку, каб выпіў за нямецкую перамогу. Дольнікаў адмовіўся. Гітлеравец выхапіў наган. Кіўнуўшы на чарку, Рыгор прамовіў: "Мала".

Фашысты пераглянуліся, Адзін наліў поўную шклянку гарэлкі і моўчкі падаў палоннаму лётчыку.

А далей усё было амаль так, як піша Шолахаў у сваім апавяданні...

На долю савецкага лётчыка выпала ўсё страшнае, што магло чакаць чалавека ў фашысцкім палоне – здзекі, катаванні, голад і холад, пастаянная пагроза смерці. Але ў самыя цяжкія хвіліны Дольнікаў верыў, што паднімецца ў неба, адпомсціць ворагу за сябе і таварышаў.

У палоне, у кахоўскай турме, Дольнікаву без наркозу зрабілі аперацыю – раны на назе загніваліся, пачыналася гангрэна. Крыху ачуняўшы, ён ужо думаў, як уцячы ад ворага. У лагеры ваеннапалонных, куды яго неўзабаве перавялі, ён зблізіўся з членамі падпольнага камітэта, якія рыхтавалі ўцёкі. І вось золкай снежаньскай ноччу групе былых лётчыкаў удалося ўцячы. Разам з імі знік з лагера і Дольнікаў. Пасля доўгіх і цяжкіх блуканняў ён спыніўся ў вёсцы Ястрабінава. Там хутка наладзіў сувязь з падпольшчыкамі, якія неўзабаве пераправілі лётчыка ў партызанскі атрад "За Савецкую Радзіму", што дзейнічаў на тэрыторыі Нікалаеўскай вобласці. Праз нейкі час Дольнікава прызначылі намеснікам камандзіра.

Калі вясной 1944 года атрад злучыўся з часцямі Чырвонай Арміі, якія вызвалялі Адэскую вобласць, Дольнікаў вярнуўся ў свой 100-ты полк. Тут ён сустрэўся са сваімі баявымі сябрамі Васілём Сап'янам, Іванам Бабаком, Пятром Гучком, братамі Глінкамі. Але не было ўжо ў жывых камандзіра эскадрыллі Мікалая Лавіцкага.

Рыгора не дапускалі да палётаў. Яго, як былога палоннага, правяралі. Урэшце дазволілі лятаць. Дазволіў на свой страх і рызыку камандзір дывізіі І. М. Дзусаў (пазней, з чэрвеня 1944 года і канца вайны авіядывізіяй камандаваў А. І. Пакрышкін, а І. М. Дзусаў быў прызначаны камандзірам 6-га авіякорпуса, які ўдзельнічаў у аперацыі "Баграціён". – А. П.).

У маі – чэрвені 1’944-га Другі Украінскі фронт вёў гарачыя баі за вызваленне Малдавіі і Румыніі. Асабліва горача было пад Ясамі.

Толькі за сем дзён Яска-Кішынёўскай аперацыі Р. Дольнікаў збіў 5 нямецкіх самалётаў. За гэты подзвіг ён быў узнагароджаны ордэнам Баявога Чырвонага Сцяга.

Дольнікаў прымаў удзел у Львоўска-Сандамірскай і Берлінскай аперацыях, за што быў узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны I ступені.

Вайну закончыў у небе над Прагай. На баявым ліку лётчыка было 15 збітых нямецкіх самалётаў...

Халодным снежаньскім днём пасыльны прынёс пакет, у якім было прадпісанне з'явіцца ў распараджэнне ўпраўлення кадраў. Дольнікава адправілі на Далёкі Усход. А там на працягу пяці гадоў яго кожны

месяц выклікалі ў КДБ, давалі паперу, ручку і гаварылі: "Пішыце пра палон, як што і чаму".

Толькі моцная воля і вера ў справядлівасць ды маральная падтрымка жонкі Валі, з якой пазнаёміўся яшчэ на фронце, дапамаглі Рыгору Усцінавічу выстаяць.

Допыты скончыліся нечакана. У пяцідзесятым годзе ў Хабараўску Дольнікаў сустрэў свайго аднапалчаніна, які параіў паступіць у ваенную акадэмію. А праз некаторы час пасля вучобы, у 1954 годзе (ужо пасля арышту Берыя ў 1953 г. – А. П.), Дольнікава папрасіў зайсці да яго нейкі палкоўнік. Ён паказаў лётчыку дзве папкі, на якіх было напісана "Справа аб палоне", і на вачах здзіўленага Рыгора Усцінавіча спаліў іх, сказаўшы: "Болей ніхто і ніколі вас гэтым не папракне"...

Дык ці сапраўды ваенны лёс Дольнікава пакладзены Шолахавым у аснову апавядання "Лёс чалавека"? І ці сустракаўся Дольнікаў з Шолахавым?

З гэтым пытаннем да яго звярталіся многія. І заўсёды Дольнікаў адказваў, што з Шолахавым яму сустракацца і гутарыць не даводзілася, а Сакалова вобраз хутчэй за ўсё збіральны.

Але вось у 1982 годзе выйшла кніга Р. Дольнікава "Ляціць стальная эскадрылля" – успаміны пра вайну, пра сваіх баявых таварышаў-аднапалчан. У кнізе быў і эпізод аб допыце.

У хуткім часе пасля выхаду кнігі аўтара адшукаў вядомы літаратар-гісторык Хведар Хведаравіч Шахмагонаў (дарэчы, ён сцэнарыст фільма "Лёс чалавека". – А. П.).

Ён напомніў Дольнікаву пра адну падзею 1947 года... Тады ў Маскве на адным урачыстым пасяджэнні ў Мар'інай Рошчы, на якой прысутнічаў лётчык Дольнікаў, выступаў малады пісьменнік Х. Шахмагонаў. Пасля ўрачыстасцей быў банкет. Вось тут Дольнікаў не вытрымаў і ў кругу сяброў расказаў пра тое, як у час вайны трапіў у палон, як ворагі прымушалі яго піць гарэлку за іхнюю перамогу і як ён выпіў, але не за гэта, не закусваючы, тры шклянкі запар. Гэта чуў і Шахмагонаў. Пасля ён папрасіў, каб лётчык больш падрабязна расказаў пра той эпізод са свайго ваеннага жыцця, маўляў, напішу ў газету. Але Дольнікаў катэгарычна адмовіўся. І гэта зразумела: тады яшчэ не толькі пісаць, але і ўспамінаць пра палон было небяспечна.

І вось праз дванаццаць гадоў Рыгор Усцінавіч Дольнікаў прачытаў апавяданне Міхаіла Шолахава "Лёс чалавека". Яно яго вельмі ўразіла. Яшчэ б, у адным з эпізодаў з лёсу Сакалова ён пазнаў эпізод са свайго жыцця. Вось толькі лётчык ніяк не мог здагадацца, адкуль пісьменнік даведаўся пра выпадак у палоне...

Пазней ужо лёс нечакана звёў Дольнікава з маладым маёрам Шахмагонавым. Прозвішча падалося знаёмым. Высветлілася, што ў маёра бацька пісьменнік, працуе сакратаром у Міхаіла Шолахава. Успомніўся 1947 год, Масква, урачыстасці, банкет і малады пісьменнік, які вельмі зацікавіўся адным з фактаў з біяграфіі Дольнікава. Значыць,

Шахмагонаў расказаў Міхаілу Аляксандравічу тое, што чуў тады ад лётчыка, а Шолахаў скарыстаў выпадак у сваім творы...

Але, цікава, як далей склаўся лёс адважнага пілота...

У пасляваенныя гады Рыгор Усцінавіч Дольнікаў камандаваў рознымі авіяцыйнымі падраздзяленнямі (прайшоў шлях ад камандзіра эскадрыллі да камандзіра авіязлучэння), быў лётчыкам-выпрабавальнікам. Ён асвоіў 40 тыпаў самалётаў, лятаў таксама больш сарака гадоў – і ўвесь час знішчальнікам. Ваяваў у Эфіопіі і Егіпце. Ужо ў мірны час, у 1978 годзе, яму за ўзорнае выкананне ўрадавага задання было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

Цяпер генерал-палкоўнік авіяцыі, заслужаны ваенны лётчык, кандыдат гістарычных навук Р. У. Дольнікаў у адстаўцы, жыве ў Маскве, займаецца грамадскай работай.

У 1983 годзе, калі Дольнікаў прыязджаў у Беларусь, аб яго жыцці быў зняты дакументальны фільм.

У Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны на адной з экспазіцый змешчана фатаграфія Р. Дольнікава, а побач – адно з першых выданняў кнігі М. Шолахава "Лёс чалавека".

**Пікулік, А. Лёс чалавека / Аляксандр Пікулік. // Маладосць. — 1996. — № 3. — С. 204—209.**